Нихай М.В.
канд. філал. навук,
дацэнт

## ГІСТАРЫЧНАСЦЬ СУЧАСНАГА СВЕТУ

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што творы 20–30-х гадоў, прысвечаныя пераважна тэме рэвалюцыі і тэме грамадзянскай вайны, не з'яўляюцца гістарычнымі. Адлюстроўваючы па гарачых слядах падзеі нядаўняе мінулае, яны ўспрымаюцца і ацэньваюцца чытачамі як творы аб сучаснасці. І ўсё ж ці можа быць прынята цалкам існуючая гісторыка-літаратурная канцэпцыя, згодна з якой гістарычны раман у 20–30-я гады ў беларускай літаратуры адсутнічаў? Як разумець сучаснасць гучання матываў рамана на тэму рэвалюцыі сёння і ў якой ступені ён набліжаецца да гістарычнага? Ці маем мы дастаткова падстаў для таго, каб далучыць да гістарычнага жанру раманы даваеннай пары? Для выпрацоўкі падыходу да мастацкага матэрыялу з пазіцыі новых патрабаванняў спатрэбіўся час. Цяпер мы маем дастатковы часавы інтэрвал, які дазваляе ўзважыць значэнне гэтых твораў больш усебакова, выкарыстаць больш прадуктыўныя падыходы, якія здольныя даць аб'ектыўны малюнак літаратурнага руху эпохі. Літаратура гэтага перыяду, якая ўступіла на шлях паскоранага развіцця, хоць і імкнулася аднавіць у сціслыя тэрміны асноўныя ступені сусветнай літаратуры, усё ж мела межы і формы асобных літаратурна-эстэтычных напрамкаў, якія аказаліся расплывучатымі, іх існаванне было ці хуткаплынным, ці не атрымала колькі-небудзь шырокага распаўсюджвання (тэма сялянства, сацыяльна-філасофская тэма і інш.). Дзейнічалі ўстаноўкі сістэмы, дыктат, якія вызначалі мэтанакіраваны характар працякання працэсу літаратуры. Крытэрыем, заснаваным на больш устойлівых і агульных заканамернасцях літаратурнага працэсу, варта прызнаць грамадскі уклад, які ўстанавіўся ў краіне і вызначаў асноўныя параметры мастацкага працэсу, яго эвалюцыйную хаду, вызначаў факт фарміравання ў гэты перыяд новай эстэтычнай сістэмы, лагічныя аспекты і дынаміка развіцця якой цалкам абумоўліваліся палітычнымі і ідэалагічнымі дэтэрмінантамі. На змест беларускай арыгінальнай літаратуры савецкага часу ўплывалі не толькі мастацка-эстэтычныя ўласцівасці, але і асаблівасці чыста ідэалагічнага парадку, дэтэрмінаванага жорсткімі ўстаноўкамі аўтакратычнага рэжыму. У гады станаўлення беларускага рамана прадаўжалі дзейнічаць сацыяльна-псіхалагічныя, маральна-філасофскія і этычна-педагагічныя вынікі грамадскіх і сацыяльна-палітычных змен, якія адбываліся ў жыцці і патрабавалі асэнсавання ў кантэксце вялікіх праблем сённяшняга жыцця і айчыннай гісторыі. На жаль, філасофска-маральная тэматыка такой жанравай разнавіднасці, як гістарычны раман, ажыццяўлялася не столькі ў рэалістычнай трактоўцы падзей і фактаў, колькі ў аднабаковым іх выбары – дасавецкая гісторыя адмаўлялася. Развіццё ўласнага гістарычнага рамана было штучна спынена, за спробы яго стварэння пісьменнікі праследаваліся (М.Гарэцкі, М.Зарэцкі, К.Чорны). Узлятаўся на штучных крылах кан'юнктуры гісторыка-рэвалюцыйны раман. За ўяўнымі ўзлётамі і цалкам рэальнымі падзеннямі стаіць неразуменне (альбо ўсвядомленае занядбанне) унутраных законаў мастацтва, яго ўласных сувязей са светам, парушэнне якіх помсціць за сябе. Але гэта не з'яўляецца прыкметай таго, што раманы аб рэвалюцыі выраіпалі не тыя задачы, што і ўласна гістарычны раман. Мы не заўсёды разумеем, што літаратура ўсё менш задавальняецца і абмяжоўваецца фіксацыяй знешняга зрэзу жыцця і ўсё больш выразна звяртаецца да чалавечай асобы як абсалютнага пункта адліку. Не забудзем і тое, што ўзнікненне і развіццё гістарычнага рамана ў літаратуры абумоўлена «перш за ўсё дасягнутым ўзроўнем абагульнення малюнкаў сучаснага жыцця». Да таго ж сёння патрэбна больш пільная цікавасць даследчыкаў да праблемы часу ў літаратурным творы. У нашы дні ўзнікае неабходнасць асэнсавання сучаснасці як магчымасці своеасаблівага падвядзення вынікаў, калі разуменне рэчаіснасці, імкненне да філасофскага, шматмернага пагружэння ў яе ўсё глыбей пранікае ва ўсе звенні мастацкай творчасці. Становіцца важнейшым творчым актам памяць, праз якую толькі і можна ўспрымаць свет. Вечнасць з адцягненага і абстрактнага ўяўлення ператвараецца ў мастацкі імператыў. Неперарыўнасць гістарычнага патоку – гэта не ілюзія. Адначасова з усведамленнем бясконцасці часу паўстае праблема аб гістарычнасці сучаснага свету. У гэтым адлюстроўваецца новы погляд на рэчаіснасць і мастацтва.

Варапаева В.С.,
прафесар

## ГУМАНІСТЫЧНЫ ІДЭАЛ У ТВОРЧАСЦІ ВАСІЛЯ ВІТКІ

Ёсць пісьменнікі, якія ніколі не адрываюцца ад родных каранёў, народных вытокаў, не разлучаюцца са сваім дзяцінствам. Яны з шырока адкрытымі вачыма не перастаюць здзіўляцца, пазнаючы свет, а потым натхнёна, эмацыянальна, жыва перадаюць у творах сваё і дзіцячае бачанне свету. Для іх галоўным з'яўляецца чалавечнасць у самай шырокай яе праяве. Менавіта да такіх аўтараў адносіцца выдатнейшы дзіцячы пісьменнік Беларусі Васіль Вітка. Прыйшоўшы ў дзіцячую літаратуру ў 1947 годзе, ён абагаціў яе ўсім тым лепшым, што ёсць у народнай творчасці, пашырыў яе межы за кошт жывой, самабытнай словатворчасці дзяцей, гульні словам. Ён ажывіў і абнавіў, творча перапрацаваў каштоўны скарб, наза-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашаны тысячагоддзямі народнага вопыту. І слова яго простае і гучнае, узбуджанае і сакавітае, даходзіць да сэрца дзіцяці.

Высокі, лірычны пафас Васіля Віткі спалучае ў сабе і фантазію, і рэальнасць. Яго творы вучаць дзяцей быць пільнымі, уважлівымі да слова, учынку, дзеяння, прыроды, навакольнага жыцця. Яны прымушаюць задумацца, паглядзець на сябе з боку, апаніць сябе і асэн-саваць пытанні:» Што я за чалавек?, Навошта прыйшоў на гэтую зямлю?, У чым маё прызначэнне?» Гаворка з дзецьмі ідзе сур'ёзна, без падману, з вялікай павагай да асобы маленькага чытача. Ідэалам для В.Віткі з'яўляецца чалавек, які не забыўся пра сваіх родных, помніць і паважае сваіх продкаў, ведае свае карані. Звяртаючыся да чытачоў, паэт піша: «Маці, бацька, браты, сястра. Яны твае самыя родныя, блізкія. Добра, калі ў цябе ёсць бабуля, дзядуля -- гэта з самага малку твае дарагія сямейнікі...» І далей: «Ці задумваўся ты, адкуль пайшоў твой род, адкуль пачалася дарога ў жыццё?

Бо твая памяць -- гэта памяць твайго роду, а над ёю -- памяць народа-- вялікая кніга, якая называецца гісторыяй.

Род і народ яднаюцца адным дарагім словам -- Радзіма".

Вось так проста і мудра падводзіць пісьменнік дзяцей да важных і складаных паняццяў.

Варта зазначыць, што ўжо ў першым сваім творы «Вавёрчына гора» матывы сямейнасці, паняцце, якое на доўгія гады страціла сваю існасць, гучаць моцна і ўсхваляванна.

Жаданне дапамагчы роднаму, блізкаму аб'ядноўвае ўсіх герояў гэтай цудоўнай казкі. Так яно і павінна быць, чуем мы мудры голас В.Віткі. Падзеі ў казцы развіваюцца імкліва. Кожная дэталь, кожны вобраз індывідуальныя, мова сакавітая -- ідзе гульня, якая захоплівае дзіця, якая прымушае яго дзейнічаць, суперажываць. Тэлеграму з маланкай нельга паслаць: «... не працуе бесперастанку... на пасылках маланка». Адзіны спадзяванак -- дождж. І вось: «З лістка на лісток пацёк ручаёк». Стары воран-каваль атрымаў тэлеграму. Зрабіў малаточак. Выручылі вавёрачку родныя і сябры.

Расказваючы дзецям пра міласэрнасць, спачуванне, смутак, радасць, В.Вітка не імкнецца выдавіць у іх слязу. Дзеці адчуваюць і гульню, і фантастычную перабольшанасць, і незвычайную падачу матэрыялу: тут і незавершаныя сказы, і паўторы, падоўжаны перабор словам, які так уласцівы ім самім.

У шматграннай творчасці В.Віткі ёсць шэраг твораў, якія дапамагаюць дзецям расці, станавіцца людзьмі. Ці то загадка, ці то лічылка, ці то жарт -- усюды пісьменнік прадстае як майстра роднага слова, мудры папечнік, вясёлы чарадзей. Творы яго вучаць спасцігаць народны дух мовы, этыкі і маралі, а значыць, выхоўваць дзяцей.

Плача коця на кухні,
Ад слёз вочкі папухлі:
-- Што з табою, мой каток,
-- Забалеў мо жываток?
-- М-мяў, -- сказаў варкоцік, --
Не баліць жывоцік.
У мяне душа баліць,
Як пяпер на свеце жыць.
Як мне жыць у хаце,
Калі хлусіць Кадя,
Смятану злізала --
На мяне сказала.

Нават у гэтым невялічкім вершы -- сур'ёзная праблема, і вырашыць яе даручана дзецям. Глыбока ведаючы, разумеючы і паважаючы дзіця, пісьменнік праз гульню, вясёлы, дабрадушны гумар вядзе яго да пазнання ісціны.

Вітка нсяк зазначыў, што «эмацыянальная сіла ўздзеяння слова, вышыня яго напружання вымяраюцца адной-адзінай свячой -- свячой чалавечай душы». Менавіта чалавечнасць ляжыць у аснове гуманістычнай канцэпцыі пісьменніка.

Глінік Т.М.,
канд. пед. навук,
дацэнт

## ПЫТАННІ АДРАДЖЭННЯ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ МЭНЕДЖЭРАЎ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

У мінуўшчыне Беларусі ёсць шмат чаго цікавага і каштоўнага. У гэтым сэнсе культурна-гістарычная спадчына, шматвяковая гісторыя яе стварэння і існавання адкрываюць новыя старонкі жыцця нашых продкаў. Мы ўжо ўразумелі, што асноўнай прычынай крызісу культуры з'яўляецца ідэя яе адмаўлення, змянення (прычым гвалтоўнага), якая знайшла сваё яскравае ўвасабленне ў канцэпцыі «культурнай рэвалюцыі». Згодна з гэтай ідэяй адмаўленне і разбурэнне «старой буржуазнай» культуры неабходна для стварэння новай. Знішчаліся не толькі культурныя каштоўнасці, помнікі, але і іх носьбіты і вытворцы, галоўным чынам інтэлігенцыя, барацьба з якой, магчыма, не скончыцца ніколі. На вёсцы своеасаблівая культура селяніна, заснаваная на любві і павазе да працы, да зямлі, у выніку сталінскіх «сацыялістычных пераўтварэнняў вёскі» стала называцца «культасветам», «культурным абслугоўваннем» і іншымі савецкімі неалагізмамі. Менавіта на лёсе Беларусі, яе культуры гэта добра відаць. Ігнараванне сутнасці культуры -- яе захаванне і ўзбагачэнне -- зрабіла непапраўнае: змяненне як асноўны прынцып «культурнай рэвалюцыі» ў рэальным жыцці стаў спосабам яе разбурэння.

Аптымізацыя сучаснага культурнага жыцця, асабліва на ўзроўні рэгіёна, духоўнае яго адраджэнне



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ